17. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 454. Отряды "Грозный", "Победа", им. П.И. Багратиона, производственная группа и связные бригады им. К.Е. Ворошилова, Вилейская обл.
18. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 653. Постановления парторганов о признании граждан участниками партизанского движения Белоруссии в годы ВОВ и приложения к ним. 1974г.
19. Фонд 1402. – Воп. 1. – Спр. 84. Списки личного состава бригады им. Л.М. Доватора Вилейской области.
20. Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 204. Бригада им. Л.М. Доватора, Вилейская обл.
21. Фонд 1407. – Воп. 1. – Спр. 78. Списки личного состава связных и агентурных работников отряда им. М.И. Калинина бригады им. С.М. Кирова Пинской области и лиц, находящихся на службе у немцев.
22. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 235. Отряд им. М.И. Калинина бригады им. С.М. Кирова Пинской области.
23. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 222. Бригада им. С.М. Кирова, Пинская обл.

## МАСАВАЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ Ў ГАНЦАВІЦКІМ РАЁНЕ Ў 1949 – 1952 ГГ. ЯК ПРЫКЛАД СІСТЭМНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ ТАГАЧАСНАЙ ГАСПАДАРКІ

*П.К. Дайлід*
Сярэдняя школа № 3 г. Івацэвічы, Беларусь

У лютым 1949 года адбыўся XIX з'езд КП(б)Б, на якім была пастаўленая задача перад партыйна-савецкімі арганізацыямі "палепшыць працу па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню створаных калгасаў і па прапагандзе сярод сялян-беднякоў і серадднякоў перавагаў калгаснага ладу" [1, стар.109]. Пасля гэтага з'езду і пачынаецца разгортванне масавай калектывізацыі заходніх абласцей Беларусі з многімі атрыбутамі гэтага працэсу 30-х гадоў. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, тэмпы росту калектыўных гаспадарак у 1949-1952 гг. былі вельмі высокія.

Партыйныя органы ўвесь гэты час імкнуліся паскорыць тэмпы калектывізацыі. У маі 1949 года пры абмеркаванні ў ЦК КП(б)Б працы Пінскага абкама звярталася ўвага на яго слабую працу па калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, адсутнасць сувязі з беспартыйным актывам. У канцы верасня 1949 года адбыўся пленум ЦК КП(б)Б, на якім было разгледжана пытанне "Аб стане і далейшых задачах калгаснага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР". Пасля гэтага пленума назіраецца фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі, якое суправаджалася парушэннем прынцыпу дабраахвотнасці. Гэтыя парушэнні былі зафіксаваныя і ў Ганцавіцкім раёне. Так, 22 ліпеня 1950 года на паседжанні бюро Ганцавіцкага райкама разглядалася пытанне аб няправільных дзеяннях старшыні Люсінскага сельсавета Мельнікава пры правядзенні калектывізацыі. Як выявілася, старшыня сельсавета Мельнікаў сам пісаў заявы ад сялянаў без іх згоды і замест подпісу ставіў крыжыкі. "В результате чего 6 крестьянских хозяйств при обобществлении сельхозинвентаря и скота отказались от того, что они подавали заявления о приеме их в колхоз" [2, арк.1].

У Пінскай вобласці партыйныя арганізацыі сталі адвольна адносіць вялікую колькасць сялянскіх двароў у катэгорыю рабочых і служачых з адначасовым адразаннем у іх зямлі. Такім чынам павялічваўся агульны працэнт калектывізацыі. Такія фальсіфікацыі адбываліся і ў Ганцавіцкім раёне [3, арк.5].

Паварот да больш хуткіх тэмпаў калектывізацыі ў Ганцавіцкім раёне адбыўся яшчэ да XIX з'езда КП(б)Б. Аднак пасля 1949 года пачынаецца фарсіраванне тэмпаў стварэння сельгасарцеляў.

За перыяд з 1944 па 1947 год у Ганцавіцкім раёне былі створаныя толькі 2 калгасы – "Перамога" ў 1945 годзе і аднаўлены калгас імя В.М.Молатава ў 1947 годзе.

У 1948 годзе тут былі створаныя яшчэ 2 сельгасарцелі – калгас імя Жданава ў вёсцы Задуб'е і калгас "Новы шлях" у вёсцы Боркі. Аднак 2 сакавіка 1949 года ў выступленні першага сакратара Ганцавіцкага РК КП(б)Б Місюліна І.А. "Аб выніках XIX з'езда КП(б)Б і задачах раённай партыйнай арганізацыі" адзначалася што "руководители района погнались за количеством, и в результате эти колхозы числились только на бумаге. Так, например, в колхозе имени Жданова ещё в начале зимы обобществили семена, но под агитацией националистических и кулацких элементов колхозники разобрали семена обратно и колхоз долгое время находился на грани развала" [4, арк.17].

У гэтым жа выступленні Місюлін І.А., аналізуючы курс партыі на правядзенне масавай калектывізацыі, заўважыў: "отдельные коммунисты, руководящие работники советских учреждений ещё робко подходят к перестройке сельского хозяйства на социалистический лад. Они говорят, что нам не нужно организовывать пока много колхозов, организуем один-два и укрепим их, а осенью ещё пару создадим. Таких людей я называю скептиками. У нас есть все возможности к тому, чтобы 1949 и 1950 годы стали годами сплошной коллективизиции сельского хозяйства в нашем районе. Нужно не робкими шагами, а вплотную, смело браться за перестройку сельского хозяйства на социалистических основах, повсеместно приступить к организации новых колхозов и укрепить существующие" [4, арк.18-19]. Такім чынам, гэтае выступленне першага сакратара райкама можна лічыць пачаткам адліку правядзення масавай калектывізацыі ў Ганцавіцкім раёне. Аднак у выступленні І.А.Місюліна ёсць і некаторыя супярэчнасці. Спачатку ён дакарае вярхушку раённай партыйнай арганізацыі ў тым, што яна "погналась за количеством", а потым выказвае тэзіс аб тым, што трэба нарошчваць тэмпы калектывізацыі. У тым жа дакладзе Місюлін І.А. заяўляе аб тым, што "к весеннему севу у нас будет не менее 20 колхозов".

У выніку правядзення масавай калектывізацыі да канца 1949 года ў Ганцавіцкім раёне было створана 37 калгасаў, якія аб'ядналі 2838 сялянскіх гаспадарак (42,6 %).[5, арк.9-297]

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што тэза першага сакратара Ганцавіцкага райкама І.А.Місюліна аб тым, што 1949 і 1950 гады павінны стаць часам суцэльнай калектывізацыі, пачала ажыццяўляцца амаль поўнасцю.

Аднак не ўсё праходзіла так гладка. Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 24-25 сакавіка 1950 года, заслухаў даклад першага сакратара ЦК КП(б)Б М.І.Гусарава "Аб мерах па выкананню пастановы ЦК УКП(б) ад 3 сакавіка 1950 года". У гэтым дакладзе адзначалася нездавальняючае кіраўніцтва справай калгаснага будаўніцтва з боку партыйна-савецкіх органаў. Задача калектывізацыі не стала для іх галоўнай, мелася шмат памылак у працэсе гаспадарчага ўмацавання сельгасарцеляў, як напрыклад: не праводзілася абагульненне сродкаў вытворчасці, не развівалася грамадская жывёлагадоўля, не было парадку ў калгасным і адзінаасобным землекарыстанні і т. п. Адзначаў Пленум і тое, што ў значнай частцы калгасаў, у тым ліку і ў Пінскай вобласці, яшчэ не створаныя вытворчыя брыгады, а за існуючымі брыгадамі не замацаваныя зямельныя надзелы, прылады працы. Нормы выпрацоўкі ў сельгасарцелях былі ў 2-3 разы ніжэй, чым рэкамендавалася ўрадам. На Пленуме крытыкавалася і праца МТС [1, стар.112]. У сваю чаргу, у Пінскім абкаме ў гэты ж час адзначалася, што "райкомы, райисполкомы и сельскохозяйственные органы несерьёзно отнеслись к выполнению постановления бюро обкома от 29 декабря 1949 года «О недостатках и ошибках в работе партийных, советских и сельскохозяйственных органов в проведении коллективизации сельского хозяйства», которое было принято на основании указаний бюро ЦК КП(б)Б. В настоящее время темп коллективизации низкий и особенно его ослабили в январе-феврале 1950 года, когда партийные и советские органы увлеклись заготовками леса, забыли о коллективизации и снизили её темп" [3, арк.4]. У Пінскім абкаме падкрэслівалася таксама, што за студзень-люты 1950 года ў Ганцавіцкім раёне колькасць

калгаснікаў павялічылася толькі на 0,1 %. Не забыліся і на тое, што ў некаторых раёнах Пінскай вобласці, у тым ліку і Ганцавіцкім, дапусцілі прыпіскі, фіктыўна павялічыўшы колькасць сялянскіх гаспадарак, аб'яднаных у калгасы [3, арк.5].

Перагібы калектывізацыі востра праявіліся ўжо ў гэты час. Сяляне ўжо абвешчаных калгасаў пачалі адмаўляцца ад абагульнення сродкаў вытворчасці і насення. Па стану на сакавік 1950 года ў Пінскай вобласці ў 223 калгасах былі не абагульнены коні, а ў Ганцавіцкім раёне – у 13 сельгасарцелях [3, арк.9].

Пасля стварэння амаль 40 калгасаў у Ганцавіцкім раёне, партыйна-савецкі апарат пачаў праводзіць палітыку масавага прыцягнення сялянаў у гэтыя калектыўныя гаспадаркі. Раённыя ўлады перыядычна падавалі звесткі аб працэнтных суадносінах калгаснікаў і адзінаасобнікаў.

Па стану на 1 снежня 1950 года з 6912 сялянскіх гаспадарак у Ганцавіцкім раёне 6071 былі ўжо калгаснікамі. [6, арк.1-19].

Аднак і тут не ўсё было так проста. У сярэдзіне 1951 года сакратар Ганцавіцкага райкама К.В.Арцёменка на пленуме адзначаў, што "*значительная часть колхозников оказались мнимыми, они вступили в колхозы и не принимают никакого участия в колхозной жизни,* а пользуются всеми правами как колхозники. На 15 июня в колхозах района не принимали участия в работе 3006 трудоспособных колхозников, не выработали минимума трудодней 1571 человек" [7, арк.20]. Такім чынам, фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі прыводзіла да адваротнага жадаемаму працэсу – рост калгаснай вытворчасці рос далека не так хутка і якасна, як гэта бачылася партыйнай вертыкалі. Часта ўсё зводзілася да фармалізму – людзі ўступалі ў калгасы, але працаваць там не спяшаліся. У 1952 годзе першы сакратар Ганцавіцкага райкама Храловіч Л.В. сведчыў, што ў 1951 годзе ў раёне не выпрацавалі мінімума працадзен 45 % усіх калгаснікаў і ўвогуле не ўдзельнічалі ў калгаснай працы 10 % калгаснікаў. У выніку, у 1951 годзе ў Ганцавіцкім раёне быў самы нізкі ў Пінскай вобласці ўраджай збожжа і бульбы, а падзеж жывёлы ў параўнанні з 1950 годам павялічыўся ў 3 разы [8, арк.2].

У 1950 годзе прадпрымаюцца меры па ўзбуйненню калгасаў, што суправаджалася новым і значным змяншэннем асабістых надзелаў сялян. 30 мая 1950 года выйшла пастанова ЦК УКП(б) "Аб узбуйненні калгасаў і задачах партыйных арганізацый у гэтай справе". Афіцыйна было аб'яўлена, што "малыя калгасы не могуць эфектыўна ўкараняць новую тэхніку і тэхналогію". Гэтае аб'яднанне як чарговая кампанія праводзілася хутка. Да пачатку 1951 года абсалютная большасць калгасаў была ўзбуйнена адміністратыўным шляхам далучэння слабых сельгасарцеляў да больш моцных. Памер гаспадаркі усталёўваўся па крытэрах, якія мелі мала чаго агульнага з праблемамі кіравання. Пры гэтым скарачалася магчымасць уліку спецыфікі мясцовых умоваў.

У Ганцавіцкім раёне ў выніку праведзенага ўзбуйнення па стану на 27 кастрычніка 1950 года застаўся 21 калгас. Не кранула аб'яднанне 11 калгасаў. Пры гэтым, можна падкрэсліць, што праца па ўзбуйненню завершылася ў верасні 1950 года. У выніку гэтага працэсу самым вялікім у раёне стаў калгас імя І.В.Сталіна, які налічваў 672 гаспадаркі калгаснікаў. Пры правядзенні ўзбуйнення сельгасарцеляў лічылася, што гэта дасць магчымасць лепш забяспечыць калгасы раллёй, пашай і зменшыць кіраўнічы апарат. Апошняе і сапраўды адбылося, адміністрацыйна-абслугоўваючы персанал калгасаў раёна у выніку аб'яднання скараціўся з 231 да 180 чалавек [9, арк.5].

Наступнай акцыяй савецкай улады ў аграрнай палітыцы было ссяленне хутароў. Меркавалася, што гэтая справа неабходная для далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калектыўных гаспадарак і паляпшэння аператыўнасці кіраўніцтва калгасамі. У Ганцавіцкім раёне налічвалася 2230 хутарскіх гаспадарак. Асабліва шмат іх было ў калгасах імя Кірава, "Светлы шлях", імя Калініна, "1-га мая", "17-га верасня", "Парыжская Камуна". Таму ў 1952 годзе хутаране Ганцавіцкага раёну пачалі перасяляцца ў вёскі [10, арк.83].

У такіх умовах да канца 1950 года калгасы заходніх абласцей Беларусі аб'яднoўвалі 83,7 % сялянскіх гаспадарак [1, стар.121]. У Ганцавіцкім раёне ў снежні 1950 года гэтая лічба была яшчэ вышэй – 87,8% [6, арк.19]. Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 12 – 14 лютага 1951 года, паставіў задачу завяршэння калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

З мэтай хутчэйшага завяршэння суцэльнай калектывізацыі дзяржава перайшла ад палітыкі абмежавання да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа. Пры гэтым, да дадзенай катэгорыі вясковага насельніцтва было аднесена шмат серадняцкіх гаспадарак. Так, у Ганцавіцкім раёне ў жніўні 1949 года было налічана спачатку 38 кулацкіх гаспадарак, а 15 кастрычніка таго ж года з іх ліку было выключана 10 гаспадарак [11, арк.15]. На такія факты звярталася ўвага ў дакладной запісцы прадастаўленай ЦК КП(б)Б у чэрвені 1950 года "О фактах извращения политики партии по отношению к середняцким хозяйствам в западных областях БССР". У Ганцавіцкім раёне "памылкова" раскулачылі 52 гаспадаркі, у Столінскім – 44, у Пінскім – 44. Многія сем'і заможных сялян былі высланы ў далекія раёны СССР. У верасні 1951 года Савет Міністраў СССР прыняў спецыяльную пастанову "Аб высяленні кулакоў з БССР". Пры яе ажыццяўленні толькі ў 1952 годзе за межы рэспублікі адправілі 4431 "кулацкую" сям'ю. 7 красавіка 1952 года Савет Міністраў БССР вырашыў перасяліць на ўсход, у Казахстан 1375 сем'яў, або 6064 чалавек [1, стар.123].

Палітыка ліквідацыі кулацтва як класа суправаджалася увядзеннем больш жорсткай падатковай палітыкі дзяржавы. У 1950 годзе норма сельскагаспадарчага падатку з адзінаасобнікаў вырасла ў два разы. Пачалася "эканамічная атака", якая растлумачвалася неабходнасцю абмежавання роста капіталістычных элементаў у вёсцы. Пад цяжарам гэтага падатку многія сяляне апынуліся на мяжы банкруцтва. Адзінае выйсце было ва ўступленні ў калгас, тым больш, што ў гэтым выпадку даўгі па сельскагаспадарчаму падатку скасоўваліся.

Зразумела, што палітыка масавай калектывізацыі не магла не выклікаць прэтэсту сялян. Формы пратэсту былі розныя, забіццё жывёлы, стварэнне "калгасаў на паперы", нявыхад на работы і іншыя. 17 кастрычніка 1949 года першы сакратар Ганцавіцкага райкама Місюлін І.А. адзначыў, што "крестьян деревень Мельники, Задубье трудно собрать на собрание, прячутся в лес или в своих постройках; поэтому в этих деревнях с коллективизацией дело обстоит не благополучно" [4, арк.62]. Былі яшчэ і факты актыўнага супраціўлення сялян калектывізацыі. Так, па сведчанні таго ж Місюліна І.А., "в нашем районе кулацко-националистические группы сожгли имущество 3 председателей колхозов, жгут сено и т.д." [4, арк.61]. Цікавымі з'яўляюцца праявы салідарнасці вяскоўцаў у той складаны час. Так, у калгасе імя Жданава Ганцавіцкага раёна быў арыштаваны "адзін сабатажнік калгаснага ладу", які ўступіў у калгас і прадаў свайго вала. У выніку "за него приходила в райком, райисполком, прокуратуру и суд целая делегация во главе с председателем колхоза, прося об его освобождении" [4, арк.42].

У верасні 1952 года адбыўся XX з'езд КП(б)Б, які канстатаваў завяршэнне працэсу калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі і ахарактарызаваў гэта як сур'ёзную палітычную перамогу, галоўны вынік дзейнасці партыйных арганізацый у вёсцы. Да 1 чэрвеня 1953 года было абагульнена 97,2 % адзінаасобных двароў [12, стар. 184].

Такім чынам, у 1949 – 1952 гадах у заходніх абласцях Беларусі, у тым ліку і ў Ганцавіцкім раёне, фарсіраванымі тэмпамі з выкарыстаннем прымусу і рэпрэсій была праведзена калектывізацыя, якая разбурыла індывідуальную сялянскую гаспадарку.

Узбуйненне калгасаў вяло да падрыву тых элементаў калгаснай дэмакратыі, якія дапускаліся Прыкладным Статутам сельгасарцелі. Сяляне адсоўваліся ад кіравання калгасамі. Гэтая функцыя поўнасцю перайшла да райкамаў партыі і шматлікім арганізацыям, якія пірамідай узвышаліся над калгасамі. Вынікам праведзенай калектывізацыі стала пазбаўленне сялянаў правоў выбару формаў гаспадарання на зямлі, пазбаўленне іх сродкаў вытворчасці, ператварэнне іх у механічную рабочую сілу.

Гэта і вырашыла непазбежнасць крызісу, у якім апынулася сельская гаспадарка ў пачатку 50-х гадоў. Гэты крызіс праявіўся ў далейшым зніжэнні вытворчасці і нездольнасці вёскі забяспечыць насельніцтва прадуктамі харчавання ў дастатковай ступені.

## ЛІТАРАТУРЫ


1. Белозорович В.А. Западнобелорусская деревня в 1939 – 1953 годах. – Гродно, 2004. – 148 с.
2. ДАБВ.-Ф.2219.-Воп.1.-Спр.212. Протоколы №№ 23 – 41 заседаний бюро Ганцевичского райкома КП(б)Б. Июль – декабрь 1950 г.
3. ДАБВ.-Ф.7581.-Воп.3.-Спр.929. Протокол 5-го пленума Пинского обкома КП(б)Б. 1950 г.
4. ДАБВ.-Ф.7581.-Воп.3.-Спр.798. Протоколы районных партийных собраний Ганцевичского района. 1949 г.
5. ДАБВ.-Ф.7581.-Воп.3.-Спр.869.
6. ДАБВ.-Ф.2219.-Воп.1.-Спр.224. Списки Ганцевичского райкома КП(б)Б об экономическом состоянии колхозов в области за 1950г.
7. ДАБВ.-Ф.2219.-Воп.1.-Спр.227. Протоколы пленумов Ганцевичского райкома КП(б)Б за 1951 г.
8. ДАБВ.-Ф.2219.-Воп.1.-Спр.245. Протоколы пленумов Ганцевичского райкома КП(б)Б №№ 8,9,1-3 за 1952 г.
9. ДАБВ.-Ф.2219.-Воп.1.-Спр.242. Отчеты, справки о выполнении плана заготовки кормов, о фактах нарушения устава сельхозартели и др. Июль – ноябрь 1951 г.
10. ДАБВ.-Ф.2219.-Воп.1.-Спр.264. Информации, отчеты сельхозотдела Ганцевичского райкома КП(б)Б за 1952 г.
11. ДАБВ.-Ф.7581.-Воп.3.-Спр.886. Докладные записки о выявлении кулацких хозяйств за 1949 г.
12. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. / Акад. навук БССР. Ін-т гісторыі. – Мн., 1975. – Т.5


# ТРАНСФОРМАЦИОННЫЕ ПРОЦЕССЫ В СТРУКТУРЕ МАГНАТСКИХ РОДОВ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ (ПО МАТЕРИАЛАМ ВОССТАНИЙ 1830 И 1863 гг.)


***О.В. Карпович***

Гродненский государственный университет, г. Гродно, Беларусь


Представители высшего дворянского слоя, или, как их чаще всего называют в отечественной историографии, магнаты, к идеям обоих восстаний, в большинстве своем отнеслись довольно равнодушно. В восстаниях 1830-31 и 1863-64 гг. принимали участие лишь отдельные представители могущественных белорусских родов и существенного влияния на общий ход развития событий они не оказали. Тем не менее, и среди этих лиц было немало занимательных персонажей, которых следует выделить особо.

Среди активных участников восстания 1830-31 гг. было довольно много влиятельных лиц из так называемого среднего класса дворянской знати, именитые роды «золотой шляхты» делегировали в восстание лишь некоторых своих представителей. Одним из таких родов были Сапеги, крупнейшие после князя Льва Витгенштейна землевладельцы на Беларуси [1, с. 351]. В восстании 1830-31 гг. приняли участие три князя Сапеги – Евстафий, Ксаверий и Лев. Двое первых служили офицерами в польской армии, Лев активно субсидировал повстанцев финансами. И если князья Ксаверий и Лев Сапеги после подавления восстания присягнули на верность русскому престолу и получили «всемилостивейшее прощение», то Евстафию, получившему за службу в рядах «польских инсургентов» Золотой крест Virtuti Militari и